УДК 82.09

# ФЕНОМЕН ДЕТСТВА И ЮНОСТИ В КОНТЕКСТЕ БЕЛОРУССКОЙ ПОВЕСТИ О ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЕ

*Т. Р. БОГОРАДОВА*[1)]

[1)]*Полоцкий государственный университет, ул. Блохина, 29, 211440, г. Новополоцк, Беларусь*

Рассматривается проблема детства и юности в белорусской военной повести. Феномен детства и юности в контексте военного и послевоенного времени исследуется в двух основных аспектах: через восприятие писателей, встретивших войну в детском и юношеском возрасте, и через отражение детского видения военных событий. Анализируются способы показа военной действительности в ретроспективном ракурсе на примере творчества белорусских авторов. Определены художественные средства передачи писателями военного контекста в сравнительно-историческом аспекте. Раскрываются тенденции художественного освоения действительности на примере разноплановых произведений о войне.

***Ключевые слова:*** двойное видение; эйдетизм; сдвиг сознания; поток сознания; синкретизм; ретрансляция; лирический принцип типизации.

***Благодарность.*** Статья подготовлена в рамках кафедральной госбюджетной темы ГБ 2216 «Образы “свой” – “чужой” в национальной картине мира в белорусской, русской и зарубежной литературах и языках».

# ФЕНОМЕН ДЗЯЦІНСТВА І ЮНАЦТВА Ў КАНТЭКСЦЕ БЕЛАРУСКАЙ АПОВЕСЦІ ПРА ВЯЛІКУЮ АЙЧЫННУЮ ВАЙНУ

*Т. Р. БАГАРАДАВА*[1*]

[1*]*Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, вул. Блохіна, 29, 211440, г. Наваполацк, Беларусь*

Разглядаецца праблема дзяцінства і юнацтва ў беларускай ваеннай аповесці. Феномен дзяцінства і юнацтва ў кантэксце ваеннага і пасляваеннага часу даследуецца ў двух асноўных аспектах: праз успрыманне пісьменнікаў, што сустрэлі вайну ў дзіцячым ці юнацкім узросце, і праз адлюстраванне дзіцячага бачання ваенных падзей. Аналізуюцца спосабы паказу ваеннай рэчаіснасці ў рэтраспектыўным ракурсе на прыкладзе творчасці беларускіх аўтараў. Вызначаны мастацкія сродкі перадачы аўтарамі ваеннага кантэксту праз параўнальна-гістарычны аспект. Раскрываюцца тэндэнцыі мастацкага асваення рэчаіснасці на прыкладзе разнапланавых твораў пра вайну.

***Ключавыя словы:*** падвойнае бачанне; эйдэтызм; зрух свядомасці; плынь свядомасці; сінкрэтызм; рэтрансляцыя; лірычны прынцып тыпізацыі.

***Падзяка.*** Артыкул падрыхтаваны ў межах кафедральнай дзяржбюджэтнай тэмы ДБ 2216 «Вобразы “свой” – “чужы” ў нацыянальнай карціне свету ў беларускай, рускай і замежнай літаратурах і мовах».

**Образец цитирования:**
Багарадава Т. Р. Феномен дзяцінства і юнацтва ў кантэксце беларускай аповесці пра Вялікую Айчынную вайну // Часоп. Беларус. дзярж. ун-та. Філалогія. 2018. № 2. С. 17–25.

**For citation:**
Baharadava T. R. The phenomenon of childhood and adolescence as presented in Belarusian narratives about the Great Patriotic War. *J. Belarus. State Univ. Philol.* 2018. No. 2. P. 17–25 (in Belarus.).

**Автор:**
***Татьяна Робертовна Богорадова*** – старший преподаватель кафедры мировой литературы и иностранных языков гуманитарного факультета.

**Author:**
***Tatsiana R. Baharadava***, senior lecturer at the department of world literature and foreign languages, faculty of humanities.
*t.baharadava@psu.by*

Журнал Белорусского государственного университета. Филология. 2018. № 2. С. 17–25
Journal of the Belarusian State University. Philology. 2018. No. 2. P. 17–25

# THE PHENOMENON OF CHILDHOOD AND ADOLESCENCE AS PRESENTED IN BELARUSIAN NARRATIVES ABOUT THE GREAT PATRIOTIC WAR

*T. R. BAHARADAVA*[a]

[a]*Polotsk State University, 29 Blokhin Street, Navapolack 211440, Belarus*

The article dwells on the problem of childhood and adolescence as presented in Belarusian war narratives. The author of the article does the literary research of the topic of childhood and adolescence in the context of war and post-war time. This topic in the texts is revealed via the perception of writers who faced war in either their childhood or in their youth and via children's understanding of war. The author analyses the methods of war reality depiction given from the retrospective viewpoint in the works of Belarusian writers. The research novelty lies in the fact of stating the literary devices used by Belarusian authors in creating war context through the comparative historical aspect. The author finds out the tendencies of artistic understanding and depicting reality in diverse works about war.

***Key words:*** double vision; eidetic image; shift of consciousness; stream of consciousness; syncretism; retransmission; lyrical principle of typification.

***Acknowledgements.*** Writing the article became possible owing to the fact that the author participates in the national budget topic «The images "self" – "non-serlf" in the national picture of the world as presented in Belarusian, Russian and foreign literatures and languages» (No. 2216).

## Уводзіны

Тэма ваеннага дзяцінства і юнацтва набыла актуальнае гучанне ў кантэксце мастацтва слова, калі ў літаратуру прыйшлі пісьменнікі так званага сярэдняга пакалення, якія ў ваенны перыяд былі дзецьмі. Літаратуразнавец П. Васючэнка характарызуе гэтых аўтараў наступным чынам: «Літаратары – "дзеці вайны", далёкія ад адназначнай гераізацыі ваенных падзей, унеслі свой настрой, знайшлі свой ракурс бачання… Пакаленне беларускіх празаікаў у асобах В. Адамчыка, В. Казько, І. Пташнікава, Б. Сачанкі, Я. Сіпакова, М. Стральцова, І. Чыгрынава вылучылася падабенствам жыццяпісаў, лёсаў… пошукам форм мастацкага асваення матэрыялу, адназначнасцю антываеннага гучання твораў… У полі гэтага бачання – цэлы комплекс праблем эстэтычнага, маральнага, філасофскага характару» [1, с. 3–4]. Трэба дадаць, што да пісьменнікаў, якія сустрэлі вайну ў дзіцячым узросце, адносяцца таксама А. Кудравец, У. Паўлаў, Л. Арабей, У. Дамашэвіч, П. Місько, І. Навуменка, У. Караткевіч. Не ўсе яны адлюстравалі ваенныя падзеі менавіта праз жанр аповесці, аднак агульны пафас асуджэння вайны прысутнічае ў той ці іншай ступені ў творчасці кожнага з іх.

Пакаленне шасцідзясятнікаў, да якога належаць пісьменнікі, што паказвалі вайну рэтраспектыўна, праз успрыманне дзіцяці або падлетка, мела магчымасць аб'ектыўна і завострана адлюстроўваць ваенную рэчаіснасць. Падзеі эпохі 1960-х гг., звязаныя з грамадскімі пераўтварэннямі і зменай ідэйнай парадыгмы, прывялі да своеасаблівай унутранай дысгармоніі аўтараў, непрымання імі законаў існуючай рэчаіснасці, гранічна дакладнага і вострага адлюстравання сітуацыі.

Актуальным падаецца паказ тэмы Вялікай Айчыннай вайны ў сучасным ракурсе ўспрымання, бо натуральным з'яўляецца ўзнікненне разнапланавасці пры асэнсаванні ваенных падзей, ролі чалавека ў ходзе гісторыі. Праблема ваеннага дзяцінства і юнацтва ў літаратуры набыла шматаспектнае вырашэнне. Па-першае, яна стала аб'ектам мастацкага спасціжэння праз адлюстраванне пісьменнікаў, што сустрэлі вайну ў маладым узросце. Па-другое, тэма раскрывалася праз дзіцячае ўспрыманне, перададзенае ў мастацкім творы. Асноўнай мэтай гэтага даследавання з'яўляецца разгляд праблем чалавека з улікам зрухаў свядомасці і быційнага аспекту. Вырашэнне асноўных задач ажыццяўляецца шляхам параўнання мастацкіх сродкаў адлюстравання ваеннай рэчаіснасці ў аповесцях айчынных аўтараў. Праблема вайны і дзяцінства асэнсоўвалася ў літаратурна-крытычных артыкулах і манаграфіях А. Адамовіча, С. Андраюка, В. Бечыка, П. Васючэнкі, Э. Гурэвіч, П. Дзюбайлы, В. Каваленкі, М. Тычыны. Названыя аўтары разглядаюць ваеннае дзяцінства як самастойны аб'ект даследавання.

## Вынікі і абмеркаванне

Па падліках гісторыкаў, у вайне са зброяй у руках удзельнічалі не менш за пяць тысяч дзяцей. Пакуты маленькага чалавека яшчэ з часоў Ф. М. Дастаеўскага сталі атаясамлівацца ў шырокім сэнсе з недасканаласцю будовы грамадства, у вузкім – з антычалавечым пачаткам і дэструктывізмам вайны. Як даводзіў Э. Гурэвіч, гэта ідэя была напоўнена «ў рэшце рэшт глыбокім гуманістычным сэнсам»

[2, с. 126]. Нечалавечыя ваенныя ўмовы для дзіцячай псіхікі з’яўляюцца разбуральнымі, у іх тоіцца пагроза адчужэння дзіцяці ад навакольнага свету, бо яго неакрэплая псіхіка не здольная вытрымаць адрынутасць і адзіноту.

Праблему асэнсавання вайны праз светаўспрыманне дзіцяці або падлетка акрэсліў М. Тычына: «Гэта пачуццё сувязі “аднаго” і “ўсіх” адлюстравалася востра і глыбока ў творчасці “дзяцей вайны”, тых, хто бачыў вайну на свае вочы…» [3, с. 307]. Для творчай манеры пісьменнікаў, якія перажылі ваенныя падзеі ў раннім узросце, характэрныя агульныя рысы ўспрыняцця рэчаіснасці. Іх лірычны герой – дзіця або падлетак, здольныя «рэтрансляваць» убачанае. Недастаткова сфарміраваная свядомасць пераасэнсоўвае мінулае ў так званым падвойным бачанні рэчаіснасці. Падвойнае бачанне адпавядае працэсу ўмоўнай вобразнасці: выкарыстанню міфа, казкі, сінкрэтызму ўспрымання. Усе гэтыя элементы ўтрымліваюць аповесці пра вайну В. Казько (нар. у 1940 г.). Побач з гэтым у творах пісьменніка існуе ірацыянальнае быццё: чорны сабака ў «Аповесці пра беспрытульнае каханне» (1975), міф пра «апошняга немца» ў аповесці «Высакосны год» (1972). Паводле П. Васючэнкі, «у В. Казько элемент гульні разам з іншымі праявамі дзіцячасці паддаецца эфекту адчужэння» [1, с. 53].

Паказ ваеннага мінулага ў падвойным бачанні з’яўляецца працягам літаратурных традыцый пры адлюстраванні чалавечага існавання: паводзін у памежнай сітуацыі, смерці, ахвярнасці, пачуцця віны і г. д. Рэчаіснасць для галоўнага героя аповесці В. Казько «Суд у Слабадзе» Лецечкі ўяўляецца як супастаўленне палярных паняццяў і сіл быцця: *Ён і сам жыў у тых сорак трэцім і сорак чацвёртым, але не хацеў верыць і таму жыццю. Ён адмаўляўся, адракаўся ад яго. Імкненне спазнаць дарэшты тое жыццё і адмаўленне ад таго, што такое можа быць, адначасова жылі ў ім, але існавалі як бы асобна адно ад другога. З такой дваістасцю чалавек здольны глядзець толькі сон, здольны толькі ў сне так верыць і не верыць у яго прывідную, нерэальную рэальнасць* [4, с. 152]. У творы В. Казько шукае разгадку жыццёвых чалавечых драм, «аднак не заўсёды гэты працэс азначаны ў самім тэксце. В. Казько яго агаліў, не пабаяўся падзяліцца з чытачом яго таямніцамі і яго часам неадольнымі цяжкасцямі»[1] [5, с. 100]. Асаблівасць раскрыцця чалавечага характару перадаецца ў аўтара праз выкарыстанне ўнутраных маналогаў: *І там і там нуда мая, туга мая, душыць, ціснe, што не ведаю я нічога: адкуль прыйшоў і куды пайду* [4, с. 142]. Сутнасць жыцця асэнсоўваецца праз ужыванне значнай колькасці дыялогаў персанажаў: *Калі ўжо жыць апошнія дні, дык жыць так, каб усім чарцям мулашна было, і да чаго ж добра, што ён дажыў да гэтага дня, не памёр. <…> Трэба быць разам з усімі, моцным, дужым трэба быць* [4, с. 42].

Персанаж пісьменніка – асоба, у якой жывуць два *Я*. Герой знаходзіцца ў стане душэўнага крызісу: «Нельга не верыць… што ён укладвае ў свае творы зусім матэрыяльны боль, кроў, слёзы» [6, с. 277]. У многім тэндэнцыі мастацкага асваення рэчаіснасці бяруць пачатак з біяграфіі самога В. Казько: жыццё ў дзіцячым доме, праца на Кузбасе, вучоба ў Кемераўскім горным індустрыяльным тэхнікуме, праца на шахце, у геолагаразведцы. У аповесці «Высакосны год» аўтар за аснову сюжэта ўзяў некаторыя ўражанні сваёй маладосці. У выніку ўтварыўся фон, на якім адбываецца рэтраспектыўны пошук героем часу і сябе ў ім. Аднак нельга сцвярджаць, што аўтар і яго герой – тоесныя асобы, хоць аповесць варта лічыць аўтабіяграфічнай. «Аповесць пра беспрытульнае каханне» адыходзіць ад *Я*-формы апісання. Галоўны герой Андрэй Разорка ўцякае ад самога сябе. Падаплёкай кахання героя выступае пачуццё адзіноты. Каханне адначасова з’яўляецца выйсцем з палону думак пра мінулае, аднак светлае пачуццё падаецца ілюзорным, недаўгавечным.

Своеасаблівым падагульненнем вопыту ваеннага дзяцінства В. Казько стала аповесць «Суд у Слабадзе» (1978). Кампазіцыю твора складаюць уражанні памяці галоўнага героя, які некаторы час знаходзіўся ў «кіндэрхайме»: «Вобраз Лецечкі ў аповесці “Суд у Слабадзе” – адзін з самых глыбокіх вобразаў ва ўсёй савецкай прозе чалавека, які трагічна перажыў вайну» [7, с. 282]. Трагізм сітуацыі В. Казько завастрае пры дапамозе невырашальнасці канфлікту. Лецечка сам не хоча жыць, бо яго душэўны боль занадта моцны: *Больш крыўдна было іншае: не паспеў нарадзіцца, а ўжо нібыта пракляты кімсьці, за якія грахі? Не паспеў нарадзіцца, не паспеў нічога спазнаць пра сябе, а ўжо, гавораць, час паміраць* [4, с. 28].

Па драматызме перажыванняў, сіле душэўнай адзіноты, адрынутасці ад жыцця вобраз Лецечкі блізкі да Яся Панявежы – персанажа з аповесці Б. Сачанкі (1936–1995) «Апошнія і першыя» (1968). Твор перадае душэўныя зрухі і псіхалагічны стан хлопчыка, дзяцінства якога было паранена вайной: *Я хацеў бы, каб гэта быў сон. Але гэта не сон. Не, не сон…*[2] Як адзначаў П. Васючэнка, «успрыняццю дзіцяці ўласцівы эйдэтызм – тэндэнцыя да зрокавага, чыста вонкавага асваення асяроддзя. Гульнёвы пачатак…

[1] Тут і далей пераклад наш. – *Т. Б.*

[2] *Сачанка Б.* Апошнія і першыя // Беларуская палічка [Электронны рэсурс]. 2004. URL: http://knihi.com/BarysSacanka/Aposnija i piersyja.html#1 (дата звароту: 05.02.2018).

замацоўвае гэту тыпалагічную тоеснасць» [1, с. 7]. Пацвярджаецца той факт, што дзеці ад прыроды – аптымісты, іх псіхіка «ставіць абарону» ўсім негатыўным праявам рэчаіснасці. Паўтаральнымі ў творах аўтараў гэтага пакалення з'яўляюцца матывы пакалечанага вайной дзяцінства і юнацтва, маленькага чалавека як ахвяры вайны, перадаецца псіхалагічны стан несфарміраванай асобы, паказваецца разбурэнне яе гарманічнага існавання. Пісьменнікі адлюстроўваюць гэтыя аспекты з розных ракурсаў: праз трагізм паказу падзей і фізічную смерць падлетка, праз душэўныя пакуты і зрухі свядомасці дзіцяці пасля перанесеных выпрабаванняў, душэўнае перараджэнне асобы.

Падзеям вайны прысвяціў некаторыя творы і аповесці П. Місько (1931–2011). У герояў аповесцей «Поезд ішоў на захад» (1972) і «Калянае лісце» (1974) гэтых твораў нялёгкі лёс. У гады вайны і ў пасляваенны час яны засталіся людзьмі, не зламаліся ад выпрабаванняў і жыццёвых абставін. Вядучымі ў творчасці П. Місько застаюцца вобразы жанчын і дзяцей, лёс якіх даволі трагічны і складаны ў паказе аўтара. У аповесці «Калянае лісце» вастрыня канфлікту заключаецца ў адлюстраванні драматычнага лёсу маладога мастака-падпольшчыка, які гіне ад рук немцаў.

Адчуванне трагізму сітуацыі ў аповесцях В. Казько, Б. Сачанкі, М. Стральцова ствараецца шляхам кантраснага паказу вобраза старэйшага і новага пакаленняў. Вобраз сталага чалавека Захар'і ў аповесці В. Казько «Суд у Слабадзе» падкрэслівае вастрыню болю знявечанага вайной дзяцінства: *Ты не крыўдуй на мяне, хлопец, не сярчай на мяне, такі я ўжо ўдаўся, сурочлівы і бязглузды... Малы ты яшчэ, малы... А яно, разумееш, да смерці трэба загадзя рыхтавацца. Ад сумы ды ад турмы, гавораць, не заракайся, а ад смерці – не бяжы. І пад зямлёй яна цябе знойдзе, дастане ўсюды. Так стрэнь яе па-людску* [4, с. 10]. Вобраз дзеда, які распавядае прытчу ў аповесці Б. Сачанкі «Апошнія і першыя», падаецца праз фальклорнае ўяўленне і спрыяе ўзмацненню трагізму сітуацый быцця ў дачыненні да светаўспрымання маленькага хлопчыка, вучыць яго жыццёвай кемнасці: *Што ёй тутака рабіць, той нечысці, у гразі, пяску ды брудзе? Яна заўсёды тамака, дзе багацце, грошы…*[3]

Пісьменнік-філосаф М. Стральцоў (1937–1987), якога цікавяць зрухі чалавечай душы, паказвае рэфлексію сталага чалавека: *Божа, не пакінь мяне без помачы, – думаў дзед. – Нешта здарылася са мной. У мяне падбілася душа. У мяне не стала душы – засталося адно шкадаванне. Мне ўсіх шкада, жальба сціскае мне сэрца, і мне хочацца плакаць*[4]. Галоўная мэта героя іншая – гарманізацыя пачуццяў, цэласнасць светаўспрымання на фоне трагічнасці быцця. У творчасці М. Стральцова і І. Пташнікава прасочваецца тэндэнцыя да паказу ваеннай рэчаіснасці шляхам ачышчальнага ўспрымання дзіцяці. Быццё адлюстроўваецца праз погляд маленькага чалавека, праз так званую чыстую лінію. Дзіцячае бачанне ваенных падзей з'яўляецца своеасаблівым маральным каталізатарам, судом над створаным злом. Як заўважыла Т. Шамякіна, пішучы пра лірычны пачатак творчасці празаікаў, «сучасныя беларускія пісьменнікі, лірыкі па складзе свайго таленту, – Я. Брыль, ранні І. Навуменка, М. Стральцоў, У. Караткевіч – успрынялі лепшыя традыцыі як аналітыка-эпічнай, сінтэтычна-драматызаванай, так і лірычнай прозы М. Багдановіча, З. Бядулі, Я. Коласа, М. Зарэцкага, М. Лынькова, хоць пісьменнікі гэтыя вельмі ўсе розныя, ды і лірызм іх значна адрозніваецца ад сучасных яго выяўленняў» [8, с. 4]. Агульнай для ўсіх разгледжаных твораў з'яўляецца тэндэнцыя ўвядзення прыродных апісанняў у плынь сюжэта, якая мае своеасаблівае аўтарскае выражэнне і падпарадкавана вырашэнню розных задач. У М. Стральцова праяўляюцца прыёмы лірызацыі: пісьменніка цікавіць узаемадзеянне прыроды і чалавека. У аповесці «Адзін лапаць, адзін чунь» (1970) лірызацыя прыроды з'яўляецца фонам для перадачы фізічнага і псіхічнага стану дзіцяці: *На раскапаным ля пограба сумёце таксама была стрэшка, сутонліва-белая і лёгкая, як аблачынка ці птушынае пяро, і – мройлівая ў сваёй прыцемненай белі. Пазёмка сцішана шоргала па сумёце, празрыста-дымна распаўзаючыся за агародам у полі. Ён увабраў галаву ў плечы, не зважаючы, што непрыемна-халадна дакрануўся да шчакі зледзянелы матузок ад аблавушкі, і – глядзеў*[5]. Увогуле варта казаць пра адсутнасць класічнага сюжэта ў творы. Аповесць з'яўляецца ўзорам лірычнай прозы.

Прыёмы лірызацыі прыроднага пачатку сустракаюцца і ў аповесці І. Навуменкі (1925–2006) «Замець жаўталісця» (1977). Творчасць пісьменніка характарызуецца пэўнай рамантызацыяй маладосці, супастаўленнем яе сутнасці з антычалавечым пачаткам вайны. Своеасаблівым фонам для адлюстравання псіхалагічнага стану маладых людзей, а таксама кантрасту двух несумяшчальных быційных пачаткаў – ваенных падзей і мірнага жыцця – выступае ў названай аповесці паказ прыродных з'яў. Пісьменнік наогул паэтызуе ваенную маладосць. Першасны ваенны вопыт маладых людзей мяжуе

[3] *Сачанка Б.* Апошнія і першыя // Беларуская палічка [Электронны рэсурс]. 2004. URL: http://knihi.com/BarysSacanka/Aposnija i piersyja.html#1 (дата звароту: 05.02.2018).
[4] *Стральцоў М.* Адзін лапаць, адзін чунь // Belarusianreading [Электронны рэсурс]. 2015. URL: https://belarusianreading.wordpress.com/2015/08/23/straltsou-adzin-lapaz-adzin-chun/ (дата звароту: 29.01.2018).
[5] *Стральцоў М.* Адзін лапаць, адзін чунь // Belarusianreading [Электронны рэсурс]. 2015. URL: https://belarusianreading.wordpress.com/2015/08/23/straltsou-adzin-lapaz-adzin-chun/ (дата звароту: 29.01.2018).

з летуценнасцю і недастатковым разуменнем глыбіні і вастрыні сітуацыі, якая праз паказ прыродных малюнкаў набывае схематычнае адлюстраванне. Сталенне лірычнага героя І. Навуменкі адбываецца паступова, пад уплывам жыццёвых абставін, а прырода з'яўляецца гарманізатарам унутранага стану асобы: *Сонца вісіць даволі нізка, яго перадвячэрняе святло часам кранае макушы таполяў, клёнаў, і тады ў іх зеляніне на імгненне ўспыхваюць залатыя бляскі. Іржышча амаль усюды пераарана, над полем, прабуючы моц крылляў перад адлётам у вырай, носяцца чародкі шпакоў*[6].

Спалучэннем рамантызаванага ўспрымання з рэалістычным паказам падзей вайны прасякнута аповесць У. Караткевіча (1930–1984) «Лісце каштанаў» (1972). Тэмай восені, вобразам лістоты, назвай аповесць пераклікаецца з прыгаданымі творамі П. Міська і І. Навуменкі. Аповед у творы У. Караткевіча вядзецца ад імя беларускага хлопца Васіля Стасевіча, якога лёс закінуў у толькі што вызвалены ад немцаў Кіеў. Апісаныя падзеі прапускаюцца праз успрыманне юнака, чыё дзяцінства і юнацтва прыпалі на ваенную пару, паказваецца, як знявечвае вайна лёсы, характары, псіхіку несфарміраваных у маральным плане маладых людзей. Аповесць, безумоўна, варта аднесці да твораў з рэтраспектыўным паказам вайны – праз апісанне яе з пазіцый падлеткаў ці дзяцей, аднак прысутнасць рамантызаванага кантэксту вылучае «Лісце каштанаў» з шэрагу падобных твораў. У гульнях, адносінах падлеткаў выразна назіраецца прысутнасць мінулай вайны. Псіхіка маладых людзей рэагуе на жорсткія і несправядлівыя жыццёвыя праявы. Недарэчная смерць некаторых падлеткаў наступае на фоне таго, як ападае лісце каштанаў. Прыродны фон спрыяе раскрыццю трагічнасці развязкі і ўзмацненню драматызму і вастрыні сітуацыі: *Вулкі ў залатых каштанах ныраюць то ўгору, то ўніз. Наводдаль цьмяна, як праз ваду, плавяцца ў нияркім сонцы залатыя купалы цэркваў. Лістота звініць, калі яе зграбаюць у купы, у якіх так добра купацца дзецям і закаханым юнакам. Замілаванне такое, што глянь на ўсё гэта – і памры, бо сэрца разрываецца ад прыгажосці ўвядання. І адначасова ад балеснай тугі, ад незваротнасці ўспамінаў, ад спозненых шкадаванняў, ад непапраўнасці… ад нянавісці*; *Пачынаюць аблятаць каштаны. І ў гэты журботны час наша апаленае, спаленае, наша забітае вайной, наша знявечанае юнацтва заўсёды, заўсёды ўспамінаецца мне*[7].

Апісанне краявідаў і прыродных з'яў у аповесці Б. Сачанкі «Апошнія і першыя» падаецца праз светаўспрыманне маленькага хлопчыка. Аўтар выкарыстоўвае прыём фальклорнага звароту. Рамантызаванае апісанне спрыяе адлюстраванню рэалістычнай знешняй падзейнасці твора, падкрэслівае кантраст праяў мірнага жыцця і ваеннай рэчаіснасці: *Я спыніўся, аслеплены сонцам, толькі на ўзлеску, перад полем. Лёгкі ранішні ветрык калыхаў загоны жыта, што падступала да самай сцежкі, і яно льсцілася, выгіналася і роўна, вусцішна гуло, шумела сівым, яшчэ неналітым коласам. <…> І адусюль, аглушаючы цудадзейную, гаючую цішыню раніцы, у неба рваліся песні, песні бязмежнай хвалы і крылатай птушынай весялосці…*[8] Абвостранаму ўспрыманню ваенных падзей спрыяе выкарыстанне аўтарам прыёму аповеду ад імя першай асобы. Стыль аповесцей Б. Сачанкі ўтрымлівае элементы лірызацыі (калі гэта датычыцца прыродных з'яў і псіхалогіі героя): у творах «Пакуль не развіднела» (1966) і «Аксана» (1971) раскрываюцца вобразы дзяўчат ва ўмовах ваеннай рэчаіснасці. Іх вобразы па-мастацку паэтызуюцца, нават калі аўтар апісвае іх у крытычных абставінах. Пры выкананні заданняў дзяўчаты праяўляюць кемлівасць, пісьменнік паказвае іх маральнае сталенне, дакладна абмалёўвае псіхалагічныя партрэты, падаючы ўнутраныя маналогі ў выглядзе плыні свядомасці. Эпічнасць аповесцей Б. Сачанкі спрыяе раскрыццю сюжэта, а публіцыстычнасць – абвастрэнню сітуацыі, якая праяўляецца гранічна і даследуецца чалавекам-аналітыкам. Так, аповесць-быль «Загадка аднаго падполля» (1970) прысвечана гібелі сарака сямі юнакоў і дзяўчат у палескім горадзе Вепры: *У Беларусі, якую ў гады вайны цалкам заняў вораг, усюды былі падпольшчыкі. У кожнай вёсцы. У кожным горадзе. Хто яны? Што мы пра іх чулі?.. Герояў было куды больш, чым мы пакуль ведаем. <…> Ні адно імя не павінна быць забыта, ні адзін подзвіг – не ўслаўлены*[9].

У творы І. Пташнікава (1932–2016) «Тартак» (1967) пейзажы і вобразы прыроды – хвоя, неба, месяц, зоркі, воблакі – набываюць сімвалічнае значэнне: *Месяц, круглы і жоўты, што ячны блін з вялікай скаварады, стаяў цяпер за плячыма над самай зямлёй. З воза здавалася, што ён бег ззаду ўздагон – ад адной сасны да другой. У небе над галавой пагусцелі зоркі, сталі чырвоныя… на небе стаяла блеклая зеленаватая зара…* [9, с. 106]. Акрамя таго, прырода выступае як праекцыя чалавечай душы, на ёй адбіваецца складанасць і зменлівасць псіхалагічнага стану кожнага героя твора.

[6] *Навуменка І.* Замець жаўталісця [Электронны рэсурс]. 2017. URL: http://znichka.16mb.com/wp-content/uploads/2017/05/137.pdf (дата звароту: 09.02.2018).

[7] *Караткевіч У.* Лісце каштанаў // Беларуская палічка [Электронны рэсурс]. 2015. URL: http://knihi.com/UladzimirKaratkievic/Liscie.html (дата звароту: 09.02.2018).

[8] *Сачанка Б.* Апошнія і першыя // Беларуская палічка [Электронны рэсурс]. 2004. URL: http://knihi.com/BarysSacanka/Aposnija i piersyja.html#1 (дата звароту: 05.02.2018).

[9] *Сачанка Б.* Загадка аднаго падполля // Помстай гарэлі сэрцы [Электронны рэсурс]. 2016. URL: http://www.vuchoba.org/b-sachanka-zagadka-adnago-padpollya.html (дата звароту: 11.02.2018).

У аповесці І. Пташнікава «Найдорф» (1976) спалучаюцца як бы дзве жыццёвыя стыхіі: вайна і мір, жыццё і смерць, стварэнне і разбурэнне. Вайна жыве ў чалавечай свядомасці: «Псіхалагічна насычанай і змястоўнай была аповесць “Найдорф”… у якой І. Пташнікаў працягнуў даследаваць вытокі гераізму» [10, с. 196]. Суадносячы «Найдорф» з іншымі творамі пра вайну канца 1970-х гг., можна заўважыць эвалюцыю яго напаўнення сучаснымі духоўнымі тэндэнцыямі: гераічная нота ў агульнай танальнасці аповесці становіцца вызначальнай, падпарадкоўваючы сабе трагічны матыў.

На фарміраванне чалавека накладваюць адбітак абставіны – сацыяльныя, бытавыя, прыродныя. У сваім творы І. Пташнікаў выключную ўвагу надаваў мастацкаму ўзнаўленню жыццёвых абставін: свет рэальнага жыцця, з аднаго боку, натуральны, а з другога – арганічна звязаны з унутраным светам чалавека. Пісьменнік у аповесці «Найдорф» выкарыстоўвае апісанне прыроды для вызначэння ідэі твора, стварэння агульнага эмацыянальнага ладу. Падзею вялікага маштабу – аперацыю «Кармаран», якая праводзілася сіламі рэзерваў групы армій «Цэнтр», – аўтар паказвае праз сітуацыю, абмежаваную ў прасторы і часе: *Грому не было чуваць; пахла дажджом і гарам. Цяжка ісці, спірае ў грудзях; за спінай, дзе вісіць ручны кулямёт Ушакова, робіцца мокра, а Жаваранка ступае і ступае па сіўцы і па верасе. Усюды ціха і трывожна* [11, с. 54]. У творы раскрыты народны характар партызанскай вайны, які пазней знайшоў свой працяг у творах А. Адамовіча, І. Чыгрынава, В. Адамчыка. Сюжэты твораў І. Пташнікава носяць пераважна хранікальны характар: у аповесці «Лонва» (1964–1982) падаецца хроніка жыцця аднайменнай вёскі ў першы пасляваенны год; у аповесці «Найдорф» гаворка ідзе пра першыя пасля вызвалення з-пад нямецкай акупацыі дні жыцця в. Венеры.

Падабенства згаданых твораў усіх аўтараў «сярэдняга пакалення» заключаецца ў тым, што перадача ўнутранага стану героя ў іх адбываецца праз паказ сімволікі знешніх праяў – пахаў, гукаў і колераў. У М. Стральцова чытаем: *Яго абступілі пахі, і зноў жа здаліся яны нясцерпна, аж да пакутлівасці, вострымі, і зноў усяго яго скаланула трывога. Пахі не адступалі, і за імі прыйшла слабасць і прыкрасць да сябе. Прыйшла, і зрабілася душна: ужо не яснілася ў галаве, нудна і слаба пачало стукаць у скроні. Ён не мог ужо так ляжаць, яму захацелася ўстаць, і, устаючы, нават узрадаваўся, што рашыўся на гэта: ён ужо ведаў, што яму трэба зрабіць*[10]. Для раскрыцця быційных пытанняў, адлюстравання ўнутранага стану чалавека В. Казько ў аповесці «Суд у Слабадзе» выкарыстоўвае прыём паказу пахаў прыроды, зямлі, якія суправаджаюць чалавечае жыццё: *Ён ужо даўно ўмеў пазнаваць жыццё і жывое па пахах, па колеры, таму што… ён часта сядзеў вось тут, на ганку, і сустракаў раніцу* [4, с. 13].

Элементам стварэння сітуацыі ў творы можа выступаць ужыванне пэўнай колеравай палітры, спецыфічнай у кожнага пісьменніка. Чэшскі крытык В. Жыдліцкі падкрэсліваў адметную ролю і ўплыў дэталі ў творах І. Пташнікава пры стварэнні карцін чалавечага быцця, адным з элементаў адлюстравання якога з’яўляецца выкарыстанне пэўнага колеру: *Ён убачыў цяпер, што немцы ўсе ў жоўтых дзягах: і падпяразаны шырокімі жоўтымі дзягамі, і плечы ў іх пераматаны, што ў коней, жоўтымі набераткамі, і вінтоўкі ў іх кароткія і жоўтыя. <…> Самі сівыя ад пылу і ўсе дробныя і маладыя, маладзей за мужчын у вёсцы* [12, с. 177–178]. Паказ асаблівасцей псіхалагічнага стану дзіцяці, напрыклад дваістасць натуры Лецечкі ў аповесці В. Казько «Суд у Слабадзе», таксама дасягаецца шляхам выкарыстання колеравага фону, найчасцей сіняга і чырвонага: *Жыць за кожную высмактаную ў яго гарачую чырвоную кроплю крыві. Жыць…* [4, с. 53]. Багатая прыродная сімволіка, а таксама традыцыйны матыў дарогі дапамагаюць аўтару ў вобразнай абмалёўцы чалавечага быцця: *І вось Лецечка пільнуе сонца. Не хочацца яму паміраць, жудасна паміраць. Ведаць пра тое, што ён памрэ на ўсходзе сонца. Сонца ўзыдзе, а цябе ўжо няма, нідзе няма* [4, с. 8]; *Была, была ў яго такая дарога ў сакавіку сорак чацвёртага ці ў жніўні сорак трэцяга – гэтага ён не памятае. Для яго тады не існавала пары года. Час быў падзелены на святло і змрок. А дарога была адначасова ў святле і ў змроку* [4, с. 120]. У аповесці Б. Сачанкі «Апошнія і першыя» для стварэння філасафічнасці і глыбіні аповеду пры паказе трагізму быцця выкарыстоўваюцца прытчы, алегорыі, ужываюцца мастацкія дэталі: *А то раней, калі яшчэ і дзеда не было на гэтым свеце, у іхняй каморы пасяліўся быў Страх. Удзень ён спакойна спаў, заваліўшыся недзе ў цёмны кут, а ўночы прачынаўся, шалеў і чаго толькі не вытвараў*[11].

У зборніках апавяданняў і аповесцей У. Паўлава (нар. у 1935 г.) «Годы нашы – птушкі» (1970) і «Ад агню і мяча» (1973) заўважна гераізуюцца ўчынкі маладых людзей. Гранічная завостранасць падзей дасягаецца дзякуючы метафарычнаму пачатку, які праяўляецца нават у назве другога зборніка: тут відавочная алюзія на словы А. Неўскага, сказаныя на адрас крыжакоў: «Хто да нас з мячом прыйдзе, ад мяча і загіне».

[10] *Стральцоў М.* Адзін лапаць, адзін чунь // Belarusianreading [Электронны рэсурс]. 2015. URL: https://belarusianreading.wordpress.com/2015/08/23/straltsou-adzin-lapaz-adzin-chun/ (дата звароту: 29.01.2018).

[11] *Сачанка Б.* Апошнія і першыя // Беларуская палічка [Электронны рэсурс]. 2004. URL: http://knihi.com/BarysSacanka/Aposnija i piersyja.html#1 (дата звароту: 05.02.2018).

Асноўныя тэмы твораў У. Дамашэвіча (1928–2014) – жыццё сялян Заходняй Беларусі, барацьба супраць нямецкай акупацыі, пасляваенная адбудова, маральныя праблемы ваеннага і пасляваеннага жыцця. Аповесці, прысвечаныя ваеннай тэматыцы, па маральна-этычным напаўненні абвостраныя, гранічна трагічныя. Назвы твораў «Між двух агнёў» (1963) і «Порахам пахла зямля» (1975) маюць фразеалагізавана-метафарычны пачатак. Аповесць-хроніка «Порахам пахла зямля» напісана жывой мовай. Асаблівую мастацкую вартасць маюць старонкі твора, якія праўдзіва адлюстроўваюць жыццё: эпізод, калі Глеб Клімёнак аб'язджае свайго каня; пошукі батарэі на першых вучэннях, першае спатканне з белафінамі і першае раненне. Тым не менш твор з'яўляецца белетрызаванай хронікай: у ім шмат падрабязных апісанняў, якія не заўсёды апраўданы мастацкім кантэкстам, назіраецца перагружанасць персанажамі, якія не рухаюць сюжэт і не ўплываюць на яго развіццё (гэта ў пэўных момантах датычыцца і вобраза галоўнага героя – Глеба Клімёнка). Паводле Г. Шупенькі, «шлях галоўнага героя – традыцыйны, у гэтым трэба шукаць нейкіх іншых, чыста мастацкіх формаў паказу жыццёвай гісторыі, расказанай аўтару прататыпам героя» [6, с. 237]. У творы няма вострага канфлікту, які рухае дзеянне, мала фабульнай цікавасці – дадзены факт з'яўляецца тыповым пры адлюстраванні рэчаіснасці шляхам апасродкаванага раскрыцця ваенных калізій. Вядучым у творы з'яўляецца аўтарскі голас, які стварае своеасаблівы падмурак для развіцця дзеяння, адметную атмасферу. Хранікальны аповед аддаляе чытача ад падзейнай канвы твора. Характарызуючы твор, Г. Шупенька адзначыў: «Гісторыя яшчэ аднаго чалавечага жыцця не стала адкрыццём новага арыгінальнага мастацкага характару» [6, с. 238].

У аповесці І. Пташнікава «Найдорф» паказаны кантраст паміж вайной і мірам, жыццём і смерцю, стварэннем і разбурэннем: *Над выганчыкам узляцеў бацян – ад стрэлу*; *уцякаў на Пагурак – на балота* [11, с. 233]. Аўтар выкарыстоўвае розныя сродкі і спосабы перадачы ваеннага быцця. Сярод іх П. Васючэнка выдзяляе зрокавыя (шэрыя, жоўтыя, белыя, цёмныя таны), слыхавыя (стрэлы, выбухі), пахавыя (порах, пыл, дым – у кантрасце з пахамі зямлі, травы, сена, зерня), дотыкавыя (боль, гарачыня, холад), смакавыя (горыч, соль, кроў на вуснах). Даследчык адзначае: «Праявы вайны часта атаясамліваюцца з дэталямі сялянскага побыту, эпізодамі вясковай працы» [1, с. 46]. У паказе псіхалагічнага стану чалавека на парозе жыцця і смерці відавочны катарсічны пачатак (Жаваранка бачыць сваіх дзяцей). Для ўзмацнення псіхалагізму ў творы аўтар выкарыстоўвае антытэзу (гарманіст і труна дзіцяці).

Натуральным з'яўляецца факт выкарыстання пісьменнікамі прыёму рэтраспекцыі для мастацкага асэнсавання ваенных падзей. У аповесці М. Стральцова «Адзін лапаць, адзін чунь» няма прамога паказу ваенных дзеянняў, але зварот у мінулае неабходны для апісання фізічнага і псіхалагічнага стану хлопчыка, у дзяцінстве якога было шмат выпрабаванняў. Своеасаблівая формула знявечанага ваеннага і пасляваеннага дзяцінства, якое праходзіла ў нястачы, заключаецца ў назве твора.

Параўноўваючы мастацкае ўвасабленне ваеннай тэмы ў творчасці пісьменнікаў, адзначым разнапланавае адлюстраванне аўтарамі ваеннай рэчаіснасці. Вобразы М. Стральцова ў многім суб'ектыўныя, больш лірычныя: пісьменнік прапускае апісанне падзей праз настрой, асабіста перажытае і адчутае. Рэаліі рэчаіснасці служаць адзінай мэце – перадаць зрухі пачуццяў пісьменніка. Стыль аўтара напружаны: адчуваецца неспакой, унутраны канфлікт. Стылявая палітра І. Пташнікава больш складаная і рэчыўная: наваколле ўспрымаецца героем шматгранна, ствараецца рэалістычны малюнак свету. У дачыненні да ўнутранага напаўнення асобы мае месца поўнае адлюстраванне ўсіх зрухаў і праяў чалавечай псіхікі, што таксама стварае цэласнае ўяўленне пра характар персанажа. Вядучым элементам стылю пісьменніка з'яўляецца перанасычанасць фразы, дэталей, выразна адчуваецца аб'ектыўны пачатак. Стыль аўтараў ахарактарызавала Т. Шамякіна: «Сімвалічныя вобразы, метафары нібы "абапіраюцца" на "намёкі" прыроды, асяроддзя, пісьменнік пазбягае ў параўнаннях адцягненых паняццяў. У стылях І. Пташнікава і М. Стральцова аб'ектыўны і суб'ектыўны пачаткі па-рознаму ўзаемадзейнічаюць, суб'ектыўнае па-рознаму ўваходзіць у аб'ектыўны змест вобраза» [8, с. 13].

У творчасці І. Пташнікава заўважаецца спецыфічнае вобразнае абагульненне, «дзе праз самую трагедыю… раскрываецца і веліч перажытага чалавекам, і яго гераізм» [7, с. 30]. У аповесці «Лонва» галоўным для аўтара было паказаць не пэўную падзею, а жыццё вёскі ў цэлым. Драматызм і трагізм дзіцячага светабачання трансфармуюцца і адлюстроўваюць сітуацыю ўжо з пункта погляду разумення дарослым чалавекам складанасці жыцця наогул, супярэчнасці кожнай асобы. Трагізм вынікае з падзей мінулай вайны. У аповесці адчуваецца ўплыў вайны на паводзіны, фарміраванне характараў людзей. Унутраны свет чалавека даследуецца І. Пташнікавым у руху супярэчлівых пачуццяў, аналітызм перадачы якіх базіруецца на сінтэзе традыцый Я. Коласа і К. Чорнага.

Адзначаецца ўплыў эстэтыкі В. Быкава на сюжэтную лінію аповесці І. Пташнікава «Тартак», героі якой, розныя па характарах, узросце, жыццёвым вопыце, ставяцца ў аднолькавую сітуацыю, перад імі ўзнікае праблема выбару: прага жыцця і непазбежнасць смерці, дабро і зло, здрадніцтва і гераізм. У сімвалічным плане падаецца смерць кожнага з герояў. У беларускай прозе аповесць дае найбольш доказныя падставы для пераасэнсавання паняцця ахвярнасці ў вайне з нацызмам. Усе героі па сваім

становішчы ў вострай сітуацыі з'яўляюцца ахвярамі вайны: *Не дзеці, дык мы астанёмся жыць. Не мы – дык дзеці. <…> Не свае – чужыя. Нехта астанецца. Усе не згараць. <…> Ты думаеш, і мне не баліць?..* [9, с. 112]. Трагізм вайны ў аповесці І. Пташнікава паказаны праз малюнкі душэўных пакут людзей, якія адчуваюць безвыходнасць свайго становішча. У творы прысутнічае інтанацыя незакончанасці: пісьменнік часта ўжывае шматкроп'і, якія перадаюць інтанацыю трывогі і напружанасці. Як адзначала Т. Шамякіна, па трагічным напаўненні, па стылі аповесць «Тартак» – адзін з самых «бязлітасна драматычных твораў у беларускай літаратуры» [8, с. 73]. Наогул вытокі псіхалагізму творчасці І. Пташнікава варта шукаць у традыцыі рускіх класікаў: Л. Талстога, І. Буніна, А. Чэхава. Паэтыка твораў аўтара мае сувязь з мастацкай традыцыяй Я. Коласа, якая тлумачыцца падабенствам прыроднага і нацыянальнага пачаткаў. На думку даследчыкаў (Т. Шамякіна, С. Андраюк), творчасць В. Быкава, І. Пташнікава, Б. Сачанкі, В. Адамчыка, В. Казько і іншых беларускіх пісьменнікаў базіруецца на ўзорах прозы К. Чорнага ў іх сучаснай інтэрпрэтацыі. Цікавасць да творчасці К. Чорнага ў аўтараў была выклікана неабходнасцю ўсвядоміць вайну з этычнага пункта гледжання, пад знакам сучасных канцэпцый маральнага вопыту мінулага.

У аповесці І. Пташнікава «Тартак» асабліва моцна праявілася ўздзеянне К. Чорнага, пра што сведчаць напружаны рытм і цяжкаватасць фразы ў творы. Даследчык А. Кучар адзначаў таксама ўплыў У. Фолкнера: «Сапраўды, Фолкнер, як і некаторыя іншыя сучасныя пісьменнікі, з ярка выражаным імкненнем да стварэння сучаснай міфалогіі, любіў браць, як ён казаў, "групу людзей" і прымушаў іх перажываць нейкія, часцей прыродныя, катастрофы» [8, с. 61–62]. У аснову аповесці «Тартак» былі пакладзены рэальныя падзеі – лёс спаленай разам з людзьмі в. Дальвы ў час блакады 1944 г. на воз. Палік.

Тэма спаленых вёсак знайшла далейшае развіццё ў творчасці А. Адамовіча, аднак адным з першых аўтараў, які ўзняў і асвятліў у айчыннай літаратуры дадзеную тэму, стаў Б. Сачанка. Па словах В. Локун, «гуманізм Б. Сачанкі абвостраны і балючы» [12, с. 36]. Аповесць «Апошнія і першыя» – гэта рэквіем жыхарам в. Вялікі Бор, якіх спалілі ў чэрвені 1943 г. Тэма ваенных гадоў з'яўляецца скразной у творчасці пісьменніка. Кніга «Барвы ранняй восені» (1961) змяшчае аповесць «Палон», у якой аўтар распрацоўваў новую, актуальную, але забароненую на той час тэму. Аповесць характарызуецца рэалістычнай дакладнасцю ў раскрыцці абставін, увагай да мастацкай дэталі і апісаннем чалавечых паводзін. Тэма выжывання чалавека на акупаванай тэрыторыі становіцца чарговай для разгляду пісьменнікамі. Ад імя шараговага салдата Макара Хатулькі ў аповесці падаецца праўдзівае апісанне чалавека ва ўмовах знаходжання на акупаванай тэрыторыі, дзе па чарзе пануюць партызаны і немцы. Тэму нямецкага палону і няволі закранае аповесць Б. Сачанкі «Аксана».

Чарговым этапам у адлюстраванні ваенных падзей праз светаўспрыманне дзіцяці стаў ракурс паказу вайны як паўсядзённага быту ва ўмовах акупацыі. Пісьменніца Л. Арабей (1925–2015), якая належыць да пакалення, чыё юнацтва прыпала на ваенныя гады, у аповесцях «Сярод ночы» (1968), «На другой зіме вайны» (1968), «Іскры ў папялішчы» (1970) у новым ракурсе паказала жыццё народа падчас акупацыі. На акупаванай тэрыторыі ваявалі партызаны і мірнае насельніцтва, сярод якога былі і дзеці. Адным з вострых пытанняў ваеннага часу стала праблема харчавання, што, як паказвае гісторыя, вырашалася вельмі неадназначна. Самы яскравы твор Л. Арабей – аповесць «На другой зіме вайны», у якой распавядаецца пра цяжкасці, з якімі сутыкаецца маленькая дзяўчынка Ніна, здабываючы ежу ў абмен на рэчы. Дзіця вымушана цягнуць цяжкі груз за плячыма: *Яшчэ не развіднела, калі Ніна пакідала вёску. Знарок выйшла так рана, каб болей было светлага дня на дарогу. Мяшок за плячыма даволі ёмкі. Кілаграмаў з сем, а мо і паўпуда* [13, с. 46]. Ежу адбірае нямецкі патруль. Праз апісанне трагічнай сітуацыі пісьменніца перадае зрухі свядомасці даведзенай да апошняй мяжы адчаю дзяўчынкі: *Яна ўпала, але торбы не выпусціла. Снег набіваўся ў рукавы, раставаў на твары. Яна захлыналася і снегам, і слязьмі і крычала: – Памажыце, людзі! Памажыце! Гады, сволачы… Не аддам… Не аддам…* [13, с. 54]; *Яна ўпала тварам у снег і загаласіла. Ёй здавалася, што яна галосіць моцна, крычыць на ўвесь горад, на ўвесь свет. Але гэта быў стогн зняможанай, даведзенай да адчаю істоты* [13, с. 54]. На гэты твор І. Мележ звярнуў увагу І. Навуменкі, адзначаючы своеасаблівае бачанне падзей акупацыі, якое мела пісьменніца. Пазней І. Навуменка, якому былі блізкія ваенныя пытанні, напісаў рэцэнзію на гэты твор. Па словах Л. Савік, «Лідзія Арабей адна з першых пачала пісаць пра жыццё беларусаў пад акупацыяй, на ўласным вопыце выяўляць непрадузятую праўду пра тыя цяжкія часы, калі людзі вымушаны былі выжываць "сярод ночы", якая працягвалася чатыры гады» [13, с. 9].

Аповесць У. Дамашэвіча «Кожны чацвёрты» (1983) працягвае тэму жыцця беларусаў на акупаваных тэрыторыях. Аўтар па-наватарску вырашае праблему ўзаемадачыненняў партызан і мясцовага насельніцтва, раскрываючы і трагічна абвастраючы тэму помсты, распачатую ў айчыннай літаратуры І. Шамякіным. Вырашэнне праблемы У. Дамашэвіч пераводзіць у іншы маральны ракурс: яно набывае ў творы трагічнае гучанне, становячыся часткай самасуду, калі людзі падначальваюцца амаль жывёльнаму інстынкту. Проза пісьменніка вылучаецца злабадзённасцю, псіхалагічнай заглыбленасцю, стрыманасцю ў фарбах, жывой мовай.

## Заключэнне

Такім чынам, падыходы да адлюстравання ўплыву ваенных падзей на дзяцінства і юнацтва ў аўтараў розныя: у творах В. Казько, М. Стральцова, Б. Сачанкі, У. Караткевіча вайна знішчае радасць існавання маладога чалавека, у аповесцях І. Навуменкі, Л. Арабей – разбурае дзяцінства, у творы П. Місько – забірае жыццё. Праблема ваеннага дзяцінства і юнацтва знайшла вырашэнне праз адлюстраванне зрухаў свядомасці чалавека, раздваенне асобы (В. Казько), лірычны прынцып тыпізацыі (М. Стральцоў), рэчыўнасць вобразных сродкаў, напружанасць рытмікі (І. Пташнікаў). Дыскурс асэнсавання ваенных з'яў падаецца аўтарамі ў новым рэчышчы. Літаратура, якая служыць на карысць асобе, пры паказе ўплыву ваенных падзей на жыццё маленькага чалавека, яго несфарміраваную псіхіку, «імкнулася вырвацца са строга дэтэрмінаваных прасторава-часавых і іншых прадметна-лакальных вызначэнняў… узняцца да ўсведамлення сутнасці праблем быцця свету і чалавека» [14, с. 7]. Выкарыстанне дзіцячай тэматыкі пры абмалёўцы ваеннай рэчаіснасці абумоўлівае гранічную трагічнасць аповеду.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Васючэнка П.* Пошукі страчанага дзяцінства: беларускія празаікі «сярэдняга пакалення» аб Вялікай Айчыннай вайне. Мінск : Навука і тэхніка, 1995.
2. *Гурэвіч Э.* Гуманістычныя аспекты праблемы: дзеці і вайна // Литература о войне и проблемы века : материалы респ. науч. конф. (Минск, апрель 1983 г.). Минск, 1986. С. 126–134.
3. *Тычына М.* Народ і вайна. Мінск : Навука і тэхніка, 1985.
4. *Казько В.* Судны дзень. Мінск : Маст. літ., 1998.
5. *Егоренкова Г.* Звено связующее : лит.-крит. ст. Минск : Маст. літ., 1990.
6. *Шупенька Г.* Прага мастацкасці. Мінск : Маст. літ., 1996.
7. *Коваленко В. А.* Общность судеб и сердец. Минск : Наука и техника, 1985.
8. *Шамякіна Т.* На лініі перасячэння : літ.-крыт. нататкі. Мінск : Маст. літ., 1981.
9. *Пташнікаў І.* Тартак. Мінск : Маст. літ., 2000.
10. *Ламека Л., Ламека Н.* Сучасная беларуская літаратура: аналіз твораў, матэрыялы да экзамену. Мінск : Кніж. дом, 2003.
11. *Пташнікаў І.* Пагоня : аповесць, апавяданні. Мінск : Маст. літ., 2009.
12. *Локун В. І.* Маральна-філасофскія пошукі беларускай ваеннай і гістарычнай прозы: 1950–1960-я гг. Мінск : Навука і тэхніка, 1995.
13. *Арабей Л.* Выбраныя творы. Мінск : Кнігазбор, 2013.
14. *Гаранин Л. Я.* Философские искания в белорусской литературе. Минск : Наука и техника, 1984.

## References

1. Vasiuchenka P. *Poshuki strachanaga dzjacinstva: belaruskija prazaiki «sjarjednjaga pakalennja» ab Vjalikaj Ajchynnaj vajne* [In search of lost childhood: Belarusian writers «of the middle generation» about the Great Patriotic war]. Minsk : Navuka i tjehnika, 1995 (in Belarus.).
2. Hurevich E. [Humanistic aspects of the problem: children and war]. In: *Literatura o voine i problemy veka* [Literature about war and problems of the century] : mater. of the rep. sci. conf. (Minsk, April, 1983). Minsk, 1986. P. 126–134 (in Belarus.).
3. Tychyna M. *Narod i vajna* [People and war]. Minsk : Navuka i tjehnika, 1985 (in Belarus.).
4. Kaz'ko V. *Sudny dzen'* [The great inquest]. Minsk : Mastackaja litaratura, 1998 (in Belarus.).
5. Yegorenkova G. *Zveno svyazuyushchee* [The link] : lit. crit. essays. Minsk : Mastackaja litaratura, 1990 (in Russ.).
6. Shupen'ka H. *Praga mastackasci* [Thirst for artistry]. Minsk : Mastackaja litaratura, 1996 (in Belarus.).
7. Kovalenko V. *Obshchnost' sudeb i serdets* [Unity of destinies and hearts]. Minsk : Navuka i tjehnika, 1985 (in Russ.).
8. Shamiakina T. *Na linii perasjachjennja* [On the intersection line] : crit. notes about lit. Minsk : Mastackaja litaratura, 1981 (in Belarus.).
9. Ptashnikau I. *Tartak.* Minsk : Mastackaja litaratura, 2000 (in Belarus.).
10. Lameka L., Lameka N. *Suchasnaja belaruskaja litaratura* [Modern Belarusian literature: works analysis, materials for examination]. Minsk : Knizhny dom, 2003 (in Belarus.).
11. Ptashnikau I. *Pagonja* [Chase] : narrative, short stories. Minsk : Mastackaja litaratura, 2009 (in Belarus.).
12. Lokun V. *Maral'na-filasofskija poshuki belaruskaj vaennaj i gistarychnaj prozy: 1950–1960-ja gg.* [Moral and philosophical strivings of Belarusian war and historical prose: 1950 –1960's]. Minsk : Navuka i tjehnika, 1995 (in Belarus.).
13. Arabej L. *Vybranyja tvory* [Selected works]. Minsk : Knigazbor, 2013 (in Belarus.).
14. Garanin L. *Filosofskie iskaniya v belorusskoi literature* [Philosophical strivings in Belarusian literature]. Minsk : Navuka i tjehnika, 1984 (in Russ.).

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 22.02.2018.*
*Received by editorial board 22.02.2018.*